**ЦІШКА ГАРТНЫ**

# За сваю волю, за волю краіны

Цішка Гартны быў частым наведвальнікам Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Ул. І. Леніна. Асабліва часта прыходзіў ён у аддзел беларускай літаратуры і бібліяграфіі. У 1928 годзе першая загадчыца гэтага аддзела бібліятэкі, энтузіястка і пачынальніца краязнаўчай бібліяграфіі на Беларусі Юлія Бібіла рыхтавала да друку бібліяграфію твораў Цішкі Гартнага. Зміцер Тодаравіч цікавіўся гэтай работай і вельмі памагаў сваімі парадамі.

У 1931 годзе Цішка Гартны падарыў бібліятэцы многа сваіх рукапісаў. Сярод іх і аўтограф рамана «Сокі цаліны».

У час вайны амаль увесь кніжны фонд бібліятэкі быў разрабаваны фашыстамі. Усе рукапісы Цішкі Гартнага таксама загінулі, частка іх асталася зусім выпадкова. Шчаслівы выпадак памог знайсці невядомы рукапіс. У адным з аддзелаў бібліятэкі стаяў даўно забыты і нікім не чапаны сейф. І вось не так даўно, калі спатрэбілася перадаць аддзел другому загадчыку, успомнілі пра забыты сейф. Якое ж было дзіва, калі ў ніжнім аддзяленні яго аказаліся рукапісы Цішкі Гартнага.

У асноўным гэта былі рукапісы твораў, напісаных у 1930—31 гадах, але сярод іх аказалася і нікому не вядомая аповесць «За сваю волю, за волю краіны», якая прапануецца чытачам. Яна напісана ў 1920 годзе, аўтарам не закончана, але, як нам здаецца, з'яўляецца цікавым мастацкім дакументам часу.

Ніна ВАТАЦЫ

I